81.411.3
К 12

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
"ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ"

УДК 808.26 – 087

КАВАЛЬЧУК АКСАНА ІВАНАЎНА

# АПЕЛЯТЫЎНАЯ ЛЕКСІКА З СЕМАНТЫКАЙ ПЕРСАНАЛЬНАСЦІ Ў ГАВОРКАХ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ

**(структурна-семантычная арганізацыя, паходжанне)**

10.02.01 – беларуская мова

Аўтарэферат дысертацыі
на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук

Навукова-
бібліяграфічны
аддзел

Гомель, 2002

81 411.3 ... К12

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Праца выканана на кафедры беларускага і тэарэтычнага мовазнаўства Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы

Навуковы кіраўнік – доктар філалагічных навук, прафесар П.У.Сцяцко, Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы, кафедра беларускага і тэарэтычнага мовазнаўства

Афіцыйныя апаненты: доктар філалагічных навук, прафесар А.М.Булыка, аддзел гісторыі мовы Інстытута мовазнаўства імя Я.Коласа НАН Беларусі

кандыдат філалагічных навук, дацэнт В.А.Ляшчынская, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны, кафедра беларускай мовы

*20504178*

[illegible]цыя-апанент Магілёўскі [illegible] універсітэт ім[illegible]ова

Абарона адбудзецца 4 ліпеня 2002 г. у 12 гадзін на пасяджэнні Савета па абароне дысертацый К.02.12.03 у Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф.Скарыны (246019, г.Гомель, вул. Савецкая, 104).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны.

Аўтарэферат разасланы 3 чэрвеня 2002 г.

Вучоны сакратар савета па абароне дысертацый Н.А.Багамольнікава

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** Апошнія дзесяцігоддзі ў беларускім мовазнаўстве адзначаны тэндэнцыяй дасканалага вывучэння народнай мовы. Адным з кірункаў дыялекталагічных даследаванняў ёсць тэматычнае вывучэнне гутарковай лексікі.

Персанальныя назоўнікі – гэта пласт дыялектнай лексікі, які на сённяшні дзень не атрымаў дастатковай распрацоўкі ў лінгвістыцы. Толькі некаторыя даследчыкі звярталіся да аналізу катэгорыі асобы ў гаворках асобных рэгіёнаў Беларусі. Так, К.М.Панюціч аналізавала асабовыя назвы ў гаворках Ушаччыны[1], эмацыйна-ацэнкавыя асабовыя намінацыі з гаворак Мёрскага раёну даследаваў М.Н.Крыўко[2].

Асабовая лексіка гродзенскіх гаворак да гэтага часу не была аб'ектам спецыяльнага даследавання. Яна выкарыстоўвалася ў якасці даследчага матэрыялу сярод іншых слоў пры распрацоўцы асобных аспектаў народна-гутарковай мовы такімі навукоўцамі, як П.У.Сцяцко, А.А.Станкевіч, П.А.Міхайлаў, В.Дз.Старычонак. Вывучэнне гэтай макраструктуры ў дачыненні да адзначанага рэгіёну, безумоўна, мае значную лінгвістычную і культуралагічную каштоўнасць. Актуальнымі застаюцца пытанні лексічна-семантычнай дыферэнцыяцыі найменняў асобы, іх структурнай арганізацыі, функцыянавання ва ўмовах этнакантактавай зоны, а таксама лінгвагеаграфічныя асаблівасці і праблемы паходжання.

Матэрыялы дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры складанні рэгіянальнага і агульнабеларускага лексічных атласаў.

**Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі.** Дысертацыйнае даследаванне выканана ў межах тэмы "Народная лексіка і словаўтварэнне Гродзеншчыны", якая распрацоўвалася кафедрай беларускага і тэарэтычнага мовазнаўства Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я.Купалы і ўваходзіла ў Дзяржаўную праграму фундаментальных даследаванняў на 1996 – 2000 гг. "Беларуская мова, яе гісторыя, сучасны стан і сувязь з іншымі славянскімі мовамі (Беларуская мова)" (№ 1001). Тэма дысертацыі ўваходзіць і ў план працы навукова-даследчай лабараторыі "Вывучэнне народнай мовы Гродзеншчыны" пры ГрДУ імя Я.Купалы і з'яўляецца часткай Дзяржаўнай праграмы "Даследаванне беларускай мовы на рубяжы тысячагоддзяў, яе гісторыі, сучаснага стану, сувязі з іншымі славянскімі мовамі" (2000 – 2005 гг.), зафіксаванай у каардынацыйным цэнтры НАН РБ.

**Мэты і задачы даследавання.** Мэта дысертацыйнага даследавання – аналіз агульнаасабовай субстантыўнай лексікі, якая ў гаворках Гродзеншчыны характарызуе асобу паводле ўзросту і полу, фізічнага стану, вонкавага выгляду, роднасці і сваяцтва. Для рэалізацыі пастаўленай мэты вырашаліся наступныя задачы:

---

[1] Панюціч К.М. Лексіка народных гаворак. – Мінск: Вышэйшая школа, 1976.

[2] Кривко Н.Н. Оценочные наименования лиц в говорах Миорского района Витебской области: Автореф. дис. ... канд. филолог. наук: 10.02.02. – Минск, 1985.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

-- выявіць у лексікаграфічных выданнях найбольш поўны склад намінацыяў асобы адзначаных лексічна-семантычных груп;

-- ахарактарызаваць семантычную арганізацыю названых лексем, вызначыць рода-відавыя і сінанімічныя адносіны паміж імі;

-- вызначыць словаўтваральную структуру субстантываў з семантыкай персанальнасці;

-- акрэсліць дачыненні гэтых адзінак да лексічнай сістэмы іншых беларускіх гаворак і сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

-- высветліць па магчымасці паходжанне агульнаасабовых назоўнікаў, якія маюць "непразрыстую" структуру.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** Аб'ект даследавання дысертацыі – агульнаасабовыя субстантывы гаворак Гродзеншчыны наступных лексічна-семантычных груп: назвы-характарыстыкі асобы паводле ўзросту і полу, фізічнага стану, вонкавага выгляду, роднасці і сваяцтва. Прадмет даследавання – структурна-семантычная арганізацыя агульнаасабовых найменняў, іх паходжанне, стасункі з лексічнай сістэмай іншых беларускіх гаворак і беларускай літаратурнай мовы.

Крыніцамі даследавання сталі апублікаваныя дыялектныя слоўнікі і матэрыялы да іх з гродзенскіх гаворак: "Матэрыялы да слоўніка Гродзенскай вобласці" (1972) і "Слоўнік Гродзенскай вобласці" (1983) Т.Ф.Сцяшковіч, "Дыялектны слоўнік: З гаворак Зэльвеншчыны" (1970) П.У.Сцяцко, "Скарбы народнай мовы" (1993) А.П.Цыхуна, "Слоўнік рэгіянальнай лексікі Гродзеншчыны" (1999), "Слоўнік гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча" у 5 тамах (1979-1986), "Беларускае дыялектнае слова" (1975) Л.Ф.Шаталавай, артыкулы ў зборніках "З народнага слоўніка" (1975), "Народнае слова" (1976), "Народная лексіка" (1977), "Жывое слова" (1978), "Народная словатворчасць" (1979), "Жывое народнае слова" (1992), а таксама ўласныя запісы і фактычны матэрыял, назапашаны навукова-даследчай лабараторыяй "Вывучэнне народнай мовы Гродзеншчыны" Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы. Шырока выкарыстаны і іншыя лексікаграфічныя працы, якія адлюстроўваюць слоўнікавы склад розных беларускіх гаворак.

**Метадалогія і метады праведзенага даследавання.** Дысертацыйнае даследаванне выканана з улікам прынятай у айчынным мовазнаўстве метадалогіі, заснаванай на агульнанавуковых падыходах да вывучэння дыялектнай лексікі, і грунтуецца на апісальным метадзе. Мэты і задачы працы абумовілі выкарыстанне таксама супастаўляльнага, гістарычнага, статыстычнага і эўрыстычнага метадаў.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.** У даследаванні ўпершыню ў беларускім мовазнаўстве ўсебакова аналізуюцца агульнаасабовыя назоўнікі гаворак Гродзеншчыны, што характарызуюць чалавека паводле ўзросту і полу, фізічнага стану, вонкавага выгляду, роднасці і сваяцтва: вызначаюцца іерархічныя і сінанімічныя сувязі паміж імі, спосабы іх утварэння, паходжанне, адносіны з адпаведнай лексікай іншых беларускіх гаворак і літаратурнай мовы.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Даследаванне будзе спрыяць вывучэнню іншых тэматычных пластоў народнай лексікі -- як гродзенскіх гаворак, так і іншых рэгіёнаў Беларусі.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Матэрыялы даследавання могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы розных пытанняў беларускай дыялекталогіі і пры выкладанні гэтага курса ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах, а таксама ў спецкурсах і спецсемінарах па лексікалогіі, словаўтварэнні, міжрэгіянальных і міжмоўных стасунках.

Вынікі даследавання могуць быць карысныя для этнографаў, гісторыкаў, культуролагаў.

Матэрыялы дысертацыі стануць каштоўнай крыніцай для тэматычнага слоўніка, рэгіянальнага атласа, а таксама пры складанні слоўніка-тэзаўруса дыялектнай лексікі.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону:**

1. Народныя гаворкі Гродзеншчыны маюць значную колькасць лексем-найменняў асобы. Большыня іх з'яўляецца вузкарэгіянальнымі адзінкамі. Некаторыя з такіх асабовых субстантываў бытуюць і ў іншых гаворках Беларусі або маюць там адпаведныя варыянты. Невялікі працэнт аналізаванай лексікі адлюстраваны ў слоўніках беларускай літаратурнай мовы.

2. Намінацыям асобы ўласціва разгалінаваная лексічна-семантычная дыферэнцыяцыя, абумоўленая ў адных выпадках рода-відавымі адносінамі, у іншых – спецыфічнасцю тэматычнага пласта лексікі, абранага за аб'ект даследавання.

3. Назоўнікі з семантыкай персанальнасці ўзнікаюць пераважна ў выніку марфемнага словаўтварэння, найперш суфіксацыі, і семантычнай дэрывацыі. Прадукцыйнасць апошняй тлумачыцца багатай асацыяцыйнасцю народнага мыслення, большай свабодай маўлення, а таксама сітуацыйнай ацэнкавасцю, якая ўзнікае падчас маўлення.

4. Гутарковыя назвы асобы вызначаюцца надзвычай багатымі сінанімічнымі сувязямі, прычынамі чаго ёсць узаемадзеянне народнай мовы і літаратурнай, узаемаўплыў розных гаворак, наяўнасць іншамоўнага ўплыву, імкненне моўнікаў да вобразнасці і эмацыйнасці выказвання.

5. Лексіка этнакантактавых рэгіёнаў, да якіх належыць і Гродзеншчына, утрымлівае важныя звесткі пра моўныя, этнічныя і этнакультурныя ўзаемадачыненні народаў. Значную частку асабовых назоўнікаў складаюць іншамоўныя словы або адзінкі, што пэўным чынам зведалі іншамоўны ўплыў.

**Асабісты ўклад аўтара.** Дысертацыйнае даследаванне выканана аўтарам самастойна. Артыкулы і матэрыялы напісаны без удзелу суаўтараў.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Дысертацыя абмяркоўвалася на пасяджэннях кафедры беларускага і тэарэтычнага мовазнаўства Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я.Купалы ў 2001 і 2002 гг. Асобныя вынікі даследавання паведамляліся на канферэнцыях: "Адам Міцкевіч і сусветная культура" (Гродна – Навагрудак, 1997), "Культура Гродзенскага рэгіёну:

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



праблемы развіцця ва ўмовах поліэтнічнага сумежжа" (Гродна, 1999), "Словообразование и номинативная деривация в славянских языках" (Гродна, 2000), "Актуальныя праблемы моўнай адукацыі вучняў ва ўмовах рэфармавання агульнаадукацыйнай школы" (Мазыр, 2001), "Пятыя навуковыя чытанні, прысвечаныя Сцяпану Некрашэвічу" (Гомель, 2001), "Купалаўскія чытанні" (Гродна, 2001).

**Апублікаванасць вынікаў.** Змест дысертацыі адлюстраваны ў 13 публікацыях. Агульная колькасць старонак – 59.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыйнае даследаванне складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі працы, чатырох раздзелаў (яны падзелены на падраздзелы і пункты), заключэння, спісу выкарыстанай літаратуры, які ўключае 162 найменні, аднаго дадатка (рэестр прааналізаваных найменняў з крыніцамі, у якіх зафіксавана лексема). У дысертацыі змешчаны 4 схемы і 3 табліцы.

Агульны аб'ём даследавання складае 135 старонак, з іх спіс выкарыстанай літаратуры – 10 старонак, дадатак – 16.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва *уводзінах* абгрунтоўваецца выбар тэмы, акрэсліваецца ступень даследаванасці асабовых найменняў у беларускім мовазнаўстве, вызначаюцца асноўныя кірункі даследавання.

**Першы раздзел** "НАЙМЕННІ АСОБЫ ПАВОДЛЕ ЎЗРОСТУ І ПОЛУ" падзяляецца на падраздзелы і пункты.

Семантычна-іерархічныя адносіны ўнутры тэматычнай групы, лексіка якой характарызуе асобу паводле ўзросту і полу, адлюстраваны ў схеме 1.

Схема 1.




У гродзенскіх гаворках бытуе некалькі зборных назоўнікаў, якім уласціва значэнне 'дзеці': *дзятвá, дзяціска (дзéціска), бахурня', блазнатá, жудá, слатá.* Найбольш пашыраная на тэрыторыі беларускіх гаворак назва – *дзятвá.* Яе з паметай "размоўнае" фіксуюць і нарматыўныя слоўнікі

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

беларускай літаратурнай мовы. Астатнім найменням уласціва пэўная эмацыйна-экспрэсіўная афарбоўка (павелічальна-ўзмацняльная, жартаўлівая і да т.п.), на жаль, не адзначаная дыялектнымі крыніцамі, але выразна выяўленая праз словаўтваральныя фарманты або сэнсавы абсяг слова.

Лексемы *дзіця' (дзіцё), дзяцёнак, дзіця'к* – найбольш агульныя і нейтральныя сярод супольных назваў малалетніх дзяцей.

У гродзенскіх гаворках шмат назваў, якія характарызуюць дзіця паводле пэўнай прыметы ці дзеяння і маюць дадатковае семантычнае адценне, большасці з іх уласціва яскравая эмацыйна-экспрэсіўная афарбоўка: *ля'ля, гарбузяня'* пяшчотл., *галавёшка* жарт., *булавёшка* экспр., *кузáка* непаш., *смаркáч, смэ'ргель* груб., *завіня'тка, ашчапёнец, дзяржýн, шты'бала, смактýн, папсэ'ль* іран.-ласк. і інш.

Дыялектнымі слоўнікамі зафіксаваны 3 множналікавыя назвы з значэннем 'дзеці': *бэхі* экспр., *рібята,* а таксама *бубначы'*. Для апошняга характэрна некаторая варыянтнасць асноўнага і канатацыйнага значэння: *бубначы'* зняв. 'пра малых дзяцей' і *бубначы'* жарт. 'дробныя дзеці'.

Сярод назваў дзяцей пераходнага ўзросту адзначаецца шэраг супольных найменняў, якія могуць называць падлеткаў як хлопчыка, так і дзяўчынку: *падлéтак, падрóстак, падрасця'к, падрашчýк, падшпáрак* жарт., *маталéтка.* Некаторыя назвы размяжоўваюць паняцці паводле полу: *паўкавалéра, падкавалéр, падхлапéц* – падлеткі мужчынскага полу, апошнія дзве лексемы могуць называць і дарослага хлопца, юнака; *паддзéўка, падлятýха* – найменні дзяўчынкі-падлетка.

Сярод назваў дарослых маладых асоб ёсць як агульныя нейтральныя найменні (*дзéўчына, дзéўка, дзяўчáта* мн., *дзяўкí* мн.; *хлóпец, хлапéц, мáлец, кавалéр*), так і субстантывы з выразнай дадатковай семантыкай, канатацыяй (*пятнастóўка, семнастóўка, дзявýля, паўпры'ца* абразл., *чарóпка* зняв., *дзіцюрнó, дзядзюрнó, маладзíк*).

Назвы асоб сталага ўзросту і старых людзей не вызначаюцца асаблівай разнастайнасцю. Сярод іх і тыя, што зведалі ўплыў іншых, суседніх, моў: *жэ'ншчына, жэ'ншчызна, жэ'нчына, мужчы'зна, стары'к.*

Дыялектнымі слоўнікамі зафіксавана 142 лексічныя адзінкі, якія ў гродзенскіх гаворках характарызуюць чалавека паводле ўзросту і полу (у агульную колькасць улучаны ўсе формы і варыянты лексемаў, не зважаючы на тое, мае адзінка самастойнае лексічнае значэнне ці не мае яго). Значную частку адзначанага пласта складаюць дэмінутыўныя і пейратыўныя формы, што з'яўляецца адметнай рысай менавіта гэтай мікраструктуры. Многія лексемы маюць роднасныя ўтварэнні ў іншых гаворках Беларусі, пераважна гэта адзінкі, для якіх характэрна найбольш агульнае значэнне (напрыклад, *дзіця', хлóпец, хлóпчык, дзяўчы'на, дзéўка* і вытворныя ад іх). Шматлікія эмацыйна-экспрэсіўныя, ацэнкавыя назвы найчасцей з'яўляюцца рэгіянальнымі ці вузкарэгіянальнымі. Прыкладна 18% аналізаваных найменняў зафіксаваны "Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы", з іх 7 адзінак – з паметамі "размоўнае" (*дзятвá, смаркáч, дзéўка* і інш.), 1 – з паметай "устарэлае" (*панéнка*), астатнія – без усялякіх паметаў.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

народнага мыслення, большай свабодай маўлення, сітуацыйна-ацэнкавым крытэрыем. У пераліку семантычных пераасэнсаванняў самымі шматлікімі з'яўляюцца метафарычныя, пераважна анімістычныя: *вóгір, павýк, кузáка, карчáк, качóлка, стары'зна, баравíк, абэ'ржа, галавéнь, асмалёнак, басэ'тля, трубá* і многія іншыя. Некаторыя адзінкі ўзніклі ў выніку метанімічных і сінекдахічных пераасэнсаванняў, найбольш іх сярод назваў асобы паводле вонкавага выгляду: *чарнóцце, шалóха, рóхля, лýпа, шчэ'рба, бэ'бах* і інш.

Сярод найменняў паводле ступені роднасці і сваяцтва вылучаюцца сінтэтычныя і аналітычныя. У гутарковай мове пераважаюць аднаслоўныя назвы, што тлумачыцца натуральным імкненнем мовы да эканоміі ў сродках перадачы паняццяў: *дваю'ранная сястрá – сяструхá, хрóсны бáцька – татýля, татýлька; хрышчóны сын – хрышчóны, хрышчóнік* і да т.п. [9, 10, 13].

4. Асабовыя намінацыі гаворак Гродзеншчыны характарызуюцца багатай сінанімікай, што сведчыць пра развітасць, выразнасць, непаўторнасць беларускай дыялектнай мовы, яе здольнасць перадаваць самыя розныя характарыстыкі чалавека як суб'екта і аб'екта шматлікіх штодзённых дачыненняў: яго выгляд, псіхічны і фізічны стан, яго паводзіны і ўчынкі, эстэтычныя і этычныя густы і г.д. Надзвычай разнастайныя сінанімічныя шэрагі здольны ўтвараць назвы паводле фізічнага стану і вонкавага выгляду, асабліва назвы неахайнага чалавека (у шэраг можа ўваходзіць 50 і болей лексем). У гаворках шырока распаўсюджаны такі тып сінонімаў, як дублеты. Часта адзінкі адрозніваюцца сваімі канатацыйнымі адзнакамі, эмацыйна-экспрэсіўнай афарбоўкай.

Развітая сінаніміка дыялектнай мовы тлумачыцца некалькімі прычынамі: узаемадзеяннем гутарковай мовы з літаратурнай, а таксама розных гаворак паміж сабою, уплывам іншых моў, вобразнасцю і эмацыйнасцю дыялектнай мовы [4, 5, 9, 11, 12].

5. Значную частку агульнаасабовай лексікі Гродзеншчыны складаюць пазычанні з іншых славянскіх і неславянскіх моў або тыя, што зведалі іншамоўны ўплыў (утварыліся ад іншамоўнай асновы ці пры дапамозе пазычанага фарманта). Сустракаюцца і выпадкі кантамінаваных формаў, што ўзніклі ў выніку ўзаемадзеяння і ўзаемапранікнення фактаў розных моўных стыхій. Такія з'явы цалкам натуральныя для тэрыторыі Гродзенскай вобласці як этнакантактавай зоны, якая здаўна была перакрыжаваннем культурных, вaенных, гандлёвых і іншых шляхоў розных народаў.

Найбольшая колькасць пазычаных назваў асобы прыйшлі ў гродзенскія гаворкі з польскай і балцкіх моў: *брысь, інвалíда, ды'гусь; ды'лда, кушпéль, кялóйша, гíрма, сýтра* і інш. Гэтыя ж мовы часта былі пасярэдніцамі пазычання з іншых моў, напрыклад нямецкай, яўрэйскай, лацінскай [2].

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Асноўныя палажэнні дысертацыі адлюстраваны ў наступных публікацыях:

## Артыкулы


1. Дудко (Кавальчук) А. Намінацыі асобы ў гаворках Зэльвеншчыны// Гарадзенскія запісы: Старонкі гісторыі і культуры. – Гродна: ГрДУ, 1997. -- Вып. 3. – С. 158-166.
2. Кавальчук А. Намінацыі асобы – пазычанні з іншых моваў у гаворках Гродзеншчыны// Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы. Серыя 1. Гуманітарныя навукі. -- № 2. – Гродна, 2000. – С. 154-158.
3. Кавальчук А. Лексемы-характарыстыкі асобы ў гаворках Гродзеншчыны// Роднае слова. – 2001. -- № 1. – С. 38-40.
4. Кавальчук А. Назвы асобы паводле адметнасцяў твару ў гаворках Гарадзеншчыны// Наша слова. – 2001. -- 24 кастрычніка. – С. 2.
5. Кавальчук А. Назвы тоўстых, трыбухатых людзей у гаворках Гарадзеншчыны// Наша слова. – 2001. -- 10 кастрычніка. – С. 2.
6. Кавальчук А. Так гарадзенцы кажуць на дзяцей// Наша слова. – 2001. -- 4 ліпеня. – С.2.


## Матэрыялы канферэнцый


7. Дудко (Кавальчук) А. Намінацыі асобы ў гаворках Гродзенскага раёну (на матэрыяле слоўніка А.П.Цыхуна «Скарбы народнай мовы»)// Свежий ветер'97: Сб. науч. работ студентов Гродненского государственного университета имени Я.Купалы. – Гродно: ГрГУ, 1997. – С. 103-105.
8. Дудко (Кавальчук) А. Семантычнае багацце народнай мовы (На матэрыяле асабовых намінацыяў у гаворках Гродзеншчыны)// Адам Міцкевіч і сусветная культура: Матэр. міжнар. навук. канф.: У 5 кнігах. – Гродна. – 1998. – Кн.5. – С. 207-219.
9. Кавальчук А. Структурная характарыстыка асабовых найменняў у гаворках Гродзеншчыны (На матэрыяле працаў П.У.Сцяцко «Дыялектны слоўнік: З гаворак Зэльвеншчыны» і А.П.Цыхуна «Скарбы народнай мовы»)// Свежий ветер'98: Сб. науч. работ студентов Гродненского государственного университета имени Я.Купалы – Гродно: ГрГУ, 1998. – С.77-80.
10. Кавальчук А. Дэрывацыйная характарыстыка некаторых асабовых найменняў з гаворак Гродзеншчыны// Словообразование и номинативная деривация в славянских языках: Матер. VII Междунар. конф. 14-15 апреля 2000 г. – Гродно, 2000. – С. 174-177.
11. Кавальчук А. Асабовыя назоўнікі Гродзеншчыны са значэннем 'слабы, хваравіты чалавек'// Пятыя навуковыя чытанні, прысвечаныя С.Некрашэвічу: Матэр. навук. канф. -- Ч.1. – Гомель: ГДУ, 2001. – С. 71-74.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

12. Кавальчук А. Назвы-характарыстыкі асобы паводле фізічнага стану (на матэрыяле гаворак Гродзеншчыны)// Актуальныя праблемы моўнай адукацыі вучняў ва ўмовах рэфармавання агульнаадукацыйнай школы: Зб. матэр. рэсп. навук.-мет. канф. (22-23 сакавіка 2001 г.). – Мазыр, 2001. – С. 38-41.

13. Кавальчук А. Семантычная дэрывацыя асабовых найменняў з гаворак Гродзеншчыны// Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні: Матэр. навук. канф. 24 кастрычніка 2001 г. – Гродна, 2002. – С. 270-277.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

# РЭЗЮМЭ

Кавальчук Аксана Іванаўна

## Апелятыўная лексіка з семантыкай персанальнасці ў гаворках Гродзеншчыны (структурна-семантычная арганізацыя, паходжанне)

**Ключавыя словы:** значэнне персанальнасці, агульнаасабовыя назоўнікі, агульнаўжывальная (рэгіянальная, вузкарэгіянальная) лексіка, прадукцыйны (непрадукцыйны, малапрадукцыйны) тып дэрывацыі, марфалагічны спосаб словаўтварэння, семантычная дэрывацыя, пазычаная лексема, сінанімічны шэраг.

**Аб'ект даследавання** – агульныя назоўнікі – найменні асобы паводле ўзросту і полу, фізічнага стану, вонкавага выгляду, ступені роднасці і сваяцтва ў гаворках Гродзеншчыны.

**Прадмет даследавання** – структурна-семантычная арганізацыя найменняў асобы, іх паходжанне, стасункі з лексічнай сістэмай іншых беларускіх гаворак і беларускай літаратурнай мовай.

**Мэта даследавання** – комплексны аналіз субстантываў вызначаных тэматычных пластоў.

**Метады даследавання** – апісальны, супастаўляльны, гістарычны, статыстычны і эўрыстычны.

**Навуковая навізна дысертацыі** ў тым, што ўпершыню ў беларускім мовазнаўстве праводзіцца комплексны аналіз персанальных субстантываў пэўных груп у гаворках Гродзеншчыны: выяўляюцца іерархічныя і сінанімічныя сувязі паміж імі, спосабы іх утварэння, паходжанне, стасункі з адпаведнай лексікай іншых беларускіх гаворак і літаратурнай мовы.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў** у тым, што яны могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы разнастайных пытанняў беларускай дыялекталогіі і ў практыцы выкладання гэтага курса ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах, а таксама на спецкурсах і спецсемінарах па лексікалогіі, словаўтварэнні, міжрэгіянальных і міжмоўных кантактах. Вынікі даследавання могуць быць карысныя для этнографаў, гісторыкаў, культуролагаў. Фактычны матэрыял можа знайсці выкарыстанне пры стварэнні рэгіянальных атласаў і тэматычнага слоўніка беларускай мовы.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



## РЕЗЮМЕ

Ковальчук Оксана Ивановна

**Апелятивная лексика с семантикой персональности в говорах Гродненщины (структурно-семантическая организация, происхождение)**

**Ключевые слова:** значение персональности, нарицательные личные существительные, общеупотребительная (региональная, узкорегиональная) лексема, продуктивный (непродуктивный, малопродуктивный) тип деривации, морфологический способ словообразования, семантическая деривация, заимствованная лексема, синонимический ряд.

**Объект исследования** – нарицательные существительные – наименования лиц по возрасту и полу, физическому состоянию, внешнему виду и степени родства' в говорах Гродненщины.

**Предмет исследования** – структурно-семантическая организация наименований лица, их происхождение, соотношение с лексической системой других белорусских говоров и белорусским литературным языком.

**Цель исследования** – комплексный анализ субстантивной лексики названных тематических групп.

**Методы исследования:** описательный, сопоставительный, исторический, статистический и эвристический.

**Научная новизна диссертации** заключается в том, что впервые в белорусском языкознании проводится комплексный анализ персональных субстантивов определённых групп в говорах Гродненшины: выявляются иерархические и синонимические связи между ними, способы их образования, происхождение, отношения с соответствующей лексикой других белорусских говоров и литературного языка.

**Практическая значимость полученных результатов** в том, что они могут быть использованы при разработке различных вопросов белорусской диалектологии и в практике преподавания этого курса в высших и средних учебных заведениях, а также на спецкурсах и спецсеминарах по лексикологии, словообразованию, межрегиональных и межязыковых контактах. Результаты исследования могут быть полезны для этнографов, историков, культурологов. Фактический материал может найти применение при создании региональных атласов и тематического словаря белорусского языка.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## SUMMARY

Kovalchuk Oksana Ivanovna

**Appelate vocabulary with semantics of personality in the dialects of Grodno region (structural and semantical organization, origin)**

**Key words:** nominal noun, common used (regional, narrow-regional) vocabulary, productive (unproductive, less productive) type of derivation, morphological method of nord-building, semantic derivation, borrowing lexeme, synonymic row.

**The object of investigation** are nouns with semantics of person's name according to the age and sex, physical state, appeorance and degree of relationship in the dialects of Grodno region.

**The subject of investigation** – structural and semantical organization of person's names, their origin, their relation with the lexical system of other Belorusian dialects and Belorusion literary language.

**The aim of investigation** – the complete analysis of substantive vocabulary of thematic groups.

**The method of investigation** – descriptive, comparable, historical, statistical and heuristic.

**The scientific noveltry of thesis** consists in that for the first time in Belorusian linguistics the complete analysis of personal substance of definite groups has been performing and also has been revealing the hierarchical and synonymic relation between them, the methods of their formation, their origin, the connection with proper vocabulary of other Belorusian diaiects and literary language.

**The practical significance of obtained results** is that they can be used in the working out of the guestions of Belorusian dialectology and in practice of the lecturer of the higher and high establishment, and at the special courses and the special seminars on Lexicology, Word-Building, inter-regional and inter-linguistic contacts. The results of investigation can be useful for the ethnographers, the historians and the culturologists. The factual material can be used also for the creation of regional atlases and thematic vocabulary.

